ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ГІСТОРЫЯ*

***HISTORY***

УДК 327 (476:4-470)"1921/1931"
http://doi.org/10/29235/2524-2369-2023-68-2-112-122

Паступіў у рэдакцыю 21.02.2022
Received 21.02.2022

**В. М. Бароўская**

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ПЫТАННЕ АДКРЫЦЦЯ ТРАНЗІТУ ПА р. НЁМАН У СІСТЭМЕ САВЕЦКА-ПОЛЬСКІХ АДНОСІН (1921–1931 гг.)

**Аннотация.** Рассматривается вопрос открытия транзита по р. Неман в период советско-польских отношений 1920-х гг., который осложнялся напряженными польско-литовскими взаимоотношениями из-за неурегулированных территориальных споров между сторонами. Организация свободного транзита по р. Неман имела важное значение для налаживания выгодных торговых отношений между Польшей и РСФСР. Политические и экономические взаимоотношения советских республик значительно усложнялись из-за неопределенного статуса р. Неман: объявление р. Неман международной рекой от г. Гродно до устья позволяло западным государствам вмешиваться во внутренние дела Литвы и связывать Польшу с Мемелем независимо от реализации плана Гиманса. Подписание Рижского мирного договора и начало новой экономической политики стали отправной точкой в постепенном процессе перехода к реальной оценке международного положения, но внешнеполитические действия Советского государства по-прежнему имели противоречивый характер. Неопределенный статус спорных территорий повысил уровень конфликтности в регионе. Предъявление СССР польскому руководству новых требований, касающихся сплава древесины по р. Неман, не привело к желаемым результатам. Ни польско-литовские переговоры в сентябре-октябре 1925 г., ни советско-литовские встречи в ноябре-декабре 1925 г. не прояснили вопрос о сплаве древесины по р. Неман.

**Ключевые слова:** советско-польские отношения, польско-литовский конфликт, интернационализация, сплав древесины, транзит

**Для цитирования:** Бароўская, В. М. Пытанне адкрыцця транзіту па р. Нёман у сістэме савецка-польскіх адносін (1921–1931 гг.) / В. М. Бароўская // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2023. – Т. 68, № 2. – С. 112–122. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2023-68-2-112-122

**Volha N. Borovskaya**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

# THE ISSUE OF OPENING TRANSIT ALONG THE RIVER NEMAN IN THE SYSTEM OF SOVIET-POLISH RELATIONS (1921–1931)

**Abstract.** The article draws attention to the issue of opening transit along the river the Neman in Soviet-Polish relations 1921–1931. The solution of the issue was complicated by tense Polish-Lithuanian relations due to the unresolved territorial disputes between the parties. Organization of free transit along the river the Neman was important not only for establishing favorable trade relations between Poland and the Soviet state. The political and economic interests of the Soviet republics were significantly complicated by the uncertain status of the Neman: its declaration as an international river from Grodno to the mouth allowed Western states to interfere in the internal affairs of Lithuania and link Poland with Memel, regardless of the implementation of the Hymans plan. The signing of the Riga Peace Treaty and the beginning of the New Economic Policy became the starting point in a gradual process of transition from a real assessment of the international situation, but the foreign policy actions of the Soviet state were, as before, contradictory. The unresolved status of the disputed territories was added, which increased the level of conflict in the region. The nomination of the USSR of new requirements to the Polish leadership on the passage of wood along the river Neman did not lead desired results. Neither the Polish-Lithuanian negotiations in September-October 1925, nor the Soviet-Lithuanian meeting in November-December 1925 changed the case of timber rafting along the Neman.

**Keywords:** Soviet-Polish relations, Polish-Lithuanian conflict, internationalization, wood alloy, transit

© Бароўская В. М., 2023

**For citation.** Borovskaya O. N. The issue of opening transit along the river Neman in the system of Soviet-Polish relations (1921–1931). *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2023, vol. 68, no. 2, pp. 112–122 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2023-68-2-112-122

**Уводзіны.** Міжнародная палітыка Савецкай дзяржавы і Польшчы, якая датычылася Прыбалтыкі ў 1920-х гг., была цесна звязана з вырашэннем тэрытарыяльных спрэчак аб прыналежнасці Віленскай і Мемельскай абласцей, інтэрнацыяналізацыяй р. Нёман. Значны інтарэс для савецкага кіраўніцтва ўяўляў паўночны ўсход Цэнтральнай Еўропы ў сувязі з канфліктамі паміж Літвой і Польшчай, у якія былі ўцягнуты Германія і заходнія дзяржавы. Польска-літоўскі тэрытарыяльны канфлікт з'явіўся амаль не апошняй прычынай марнасці намаганняў Польшчы ў першай палове 1920-х гг. дзеля стварэння саюза Балтыйскіх дзяржаў. Але стварэнне палітычна-эканамічнага блока Літвы, Латвіі і Эстоніі, які засноўваўся б на падтрымцы Польшчы і Фінляндыі, з'яўлялася задачай польскай палітыкі і ў канцы 1920-х гг. Аднак ліквідацыя канфлікту з Літвой цяпер усведамлялася як папярэдняя ўмова вырашэння гэтай задачы. Віленшчына, Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна як бы стваралі на ўсходзе "пояс бяспекі" для важнейшых польскіх эканамічных, культурных і палітычных цэнтраў, аддаляючы іх ад мяжы магчымага ўварвання праціўніка. Віленшчына з дапамогай Польшчы размяжоўвала Германію і Расію – дзве антыверсальскія дзяржавы, якія стваралі на аснове сваёй палітыкі сітуацыю антыпольскіх геапалітычных ціскоў.

Гістарыяграфія савецка-польскіх адносін міжваеннага перыяду пачалася яшчэ ў 1920-я гг., калі былі надрукаваны першыя працы, якія датычыліся гэтай праблемы [1–3]. Гэтыя працы, як і наступныя савецкія публікацыі 1920–1930-х гг. аб палітыцы СССР у адносінах заходніх суседзяў, мелі палемічны характар. У савецкай гістарычнай навуцы як міжваеннага, так і пасляваеннага часу Польшча ўяўлялася як дзяржава, якая мае агрэсіўныя памкненні супраць Савецкай дзяржавы, гатовая захапіць савецкія рэспублікі Беларусь і Украіну. У працах савецкіх гісторыкаў кіруючыя колы Польшчы абвінавачваліся ў жаданні стварыць антысавецкі блок уздоўж заходніх меж СССР, невыкананні асноўных палажэнняў Рыжскага дагавора. У 1950-я гг. пытанне савецка-польскіх адносін разглядалася па-ранейшаму з класавых пазіцый. Ф. Г. Зуеў і яго калегі лічылі арганізатарамі польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. заходнія дзяржавы, а дзеянні Польшчы і "белага руху" вывучалі ў рамках "трэцяга паходу Антанты", звяртаючы ўвагу на супярэчнасці паміж Вялікабрытаніяй, Францыяй і Польшчай, якія датычацца яе меж [4–5]. Гісторыкі пазітыўна ацэньвалі саветызацыю Польшчы ў выпадку перамогі Савецкіх рэспублік, разглядалі мэты ўсходняй палітыкі Ю. Пілсудскага ў рэчышчы антысавецкіх планаў Антанты і інтарэсаў польскага памешчыцкага землеўладання ў былых усходніх землях Рэчы Паспалітай.

У 1960-я гг. у навуковы ўжытак былі ўведзены новыя крыніцы па гісторыі польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. П. Н. Альшанскі, паважаючы ацэнкі 1950-х гг., прывёў раней невядомыя матэрыялы аб ваенных дзеяннях і палітычным баку савецка-польскіх адносін 1918–1921 гг., а таксама аб пазіцыі краін Антанты, якія ўлічвалі пры рашэнні пытання ўсходняй польскай мяжы этнаграфічныя і эканоміка-геаграфічныя фактары [6].

У польскай гістарыяграфіі ў міжваенны перыяд сфарміравалася канцэпцыя "двух ворагаў", у рамках якой РСФСР (СССР) і Германія разглядаліся як непрымірымыя сапернікі Польшчы на міжнароднай арэне, якія трымаюць Польскую дзяржаву ў "геапалітычных цісках". Працы ў асноўным мелі палемічны характар, пытанне не ставілася аб уваходжанні ў склад Польскай дзяржавы ўкраінскіх, беларускіх і літоўскіх зямель. Гісторыкі і палітыкі пісалі, што заходнія дзяржавы заплацілі Польшчы пры вырашэнні праблемы яе меж недастаткова высокую цану [7]. Наадварот, М. Бабжынскі [8] крытыкаваў канцэпцыю нацыянал-дэмакратаў, паколькі ў яе аснове тэрытарыяльнага размежавання знаходзіўся этнічны прынцып, што ў выніку прывяло да страты Польшчай часткі зямель на ўсходзе, якія ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай да яе падзелаў у XVIII ст. У перыяд да дзяржаўнага перавароту 1926 г. у працах польскіх гісторыкаў канкурыравалі як канцэпцыя інкарпарацыі эндэкаў, якія выступалі за незалежнасць Польшчы ў межах яе другога падзелу, так і погляды прыхільнікаў Ю. Пілсудскага па стварэнні федэратыўнай Польшчы.

Польскія гісторыкі, якія працавалі ў часы існавання Польскай Народнай Рэспублікі (ПНР), у сваіх ацэнках развіцця савецка-польскіх адносін паўтаралі вывады савецкай гістарыяграфіі. Такія даследчыкі, як В. Гастынская [9], А. Дзяруга [10], Е. Куманецкі [11], П. Ласоўскі [12], В. Матэрскі [13] пісалі аб характары савецка-польскіх адносін пасля стварэння Польскай дзяржавы, аб выніках польска-савецкай вайны 1919–1921 гг., тэрытарыяльных праблемах, якія ўзніклі і па віне польскага боку. Яны адзначалі супярэчлівы характар польскай знешняй палітыкі: імкненне да захопу тэрыторый на ўсходзе і абарончую пазіцыю ў пытанні аб звароце заходніх польскіх зямель. Афіцыйная гістарыяграфія ПНР не выступала супраць магчымай саветызацыі краіны ў 1920 г. і рэвалюцыйных планаў СССР у 1923 г.

На мяжы 1980–1990-х гг. пачынаецца новы этап у развіцці гістарыяграфіі праблемы. У сувязі з адкрыццём доступу да масіву архіўных дакументаў аб знешняй палітыцы Савецкай Расіі (СССР) з новых пазіцый разгарнуліся дыскусіі аб польска-савецкай вайне 1919–1921 гг. Так, І. У. Міхуціна [14] тлумачыць канфлікт паміж савецкімі рэспублікамі, Польшчай і Літвой тым, што ў польскай грамадскай думцы існавала ўпэўненасць, што польскі бок зможа набыць былую магутнасць і супрацьстаяць Германіі і Расіі пры ўмове ўключэння ў яе склад значных тэрыторый на ўсходзе. Гісторык звяртае ўвагу на планы Ю. Пілсудскага стварыць з нацыянальных ускраін былой Расійскай імперыі федэрацыю пад польскім пачаткам.

Геапалітычную пераемнасць палітыкі Савецкай Расіі ў адносінах да суседніх заходніх дзяржаў і параўнальна малы ўплыў на яе ідэалогію падкрэсліваюць сёння шматлікія гісторыкі. У зборніку артыкулаў расійскіх і замежных вучоных [15] даследуюцца суадносіны ў знешняй палітыцы СССР канцэпцый сусветнай рэвалюцыі і рэальнай палітыкі. Так, В. А. Шышкін аналізуе сувязі Савецкай Расіі з іншымі дзяржавамі ў 1920-я гг. [16]. На яго думку, галоўным для пасля-рэвалюцыйнай Расіі было імкненне забяспечыць нацыянальныя і геапалітычныя інтарэсы краіны і яе беспеку. Адлюстравана пераемнасць нацыянальнай і геапалітычнай традыцыі ў палітыцы Расіі, але без уліку намераў лідараў РКП(б) і Камінтэрна ажыццявіць на практыцы канцэпцыю сусветнай рэвалюцыі. В. А. Зубачэўскі дэманструе пераемнасць расійскай нацыянальнай і геапалітычнай традыцый у розныя адрэзкі часу [17–18]. А. В. Бабенка [19] лічыць, што савецкім кіраўніцтвам яшчэ ў 1922 г. у якасці галоўнай задачы быў вызначаны курс на дасягненне статусу вялікай дзяржавы, дзеля чаго патрабавалася вярнуць землі, страчаныя ва Усходняй Еўропе. Пры гэтым адзначаная палітыка не адрознівалася планамернасцю і прадказальнасцю. Беларускае пытанне ў савецка-польскіх адносінах як асобны прадмет даследавання разглядаецца ў працах Ю. А. Барысёнка [20]. Аўтар сцвярджае, што беларускую праблематыку спрабавалі выкарыстоўваць на сваю карысць як савецкі, так і польскі бакі, аднак савецкаму кіраўніцтву ўдалося перайсці ад метафарычных установак на ўзровень дзяржаватворчасці. Беларуская гістарыяграфія па праблеме прадстаўлена ў працах М. М. Мязгі [21–22], Р. Р. Лазько [23], В. Цынкевіча [24].

Новыя ўмовы для даследавання праблемы з’явіліся пасля заканчэння “халоднай вайны” і змянення геапалітычнай сітуацыі ў Еўропе, на змену пераадоленым фальсіфікацыям прыйшлі міфы даваенных гадоў. Пацвярджэннем гэтаму сталі матэрыялы канферэнцыі ў Варшаве (1990 г.), прысвечанай польска-савецкай вайне 1919–1921 гг. [25]. Варта звярнуць увагу на матэрыялы Е. Бальцэрака, які апраўдваў палітыку Польшчы ў адносінах да Беларусі, Літвы і Украіны, абвінавачваючы Савецкую Расію ў экспансіянізме на ўсходзе Цэнтральнай Еўропы. Польскія гісторыкі ўвялі ў навуковы ўжытак цалкам ідэалагічны тэрмін “польска-бальшавіцкая вайна”, з дапамогай якога апраўдваюць палітыку ўключэння беларускіх і літоўскіх зямель у склад Польшчы, растлумачваючы планы Ю. Пілсудскага гісторыка-геапалітычнымі і культурна-цывілізацыйнымі фактарамі.

Нягледзячы на наяўнасць значных напрацовак па гісторыі савецка-польскіх адносін міжваеннага перыяду, існуе неабходнасць далейшага вывучэння праблемы на аснове новых архіўных матэрыялаў, выдзяляючы больш дробныя сюжэты, такія, як, напрыклад, пытанне інтэрнацыяналізацыі р. Нёман. Арганізацыя свабоднага транзіту па р. Нёман мела вельмі важнае значэнне не толькі для наладжвання спрыяльных гандлёвых адносін паміж Польшчай і РСФСР, але і для сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця тэрыторыі Беларусі. Тэрытарыяльная спрэчка паміж Польшчай і Літвой негатыўна ўплывала на становішча на ўсходзе Цэнтральнай Еўропы, павышаючы напружанасць у савецка-польскіх адносінах.

**Асноўная частка.** Створаная палякамі на тэрыторыі Віленшчыны Сярэдняя Літва і Літва падпісалі пры пасрэдніцтве Лігі Нацый у лістападзе 1920 г. перамір'е, згодна з якім паміж імі была створана нейтральная зона. У снежні літоўскі бок прапанаваў Польшчы свабодны транзіт да мора па р. Нёман у абмен на зварот Віленшчыны, але польскі бок лічыў, што прэлімінарны мір з Савецкай Расіяй 12 кастрычніка 1920 г. ануляваў савецка-літоўскі дагавор 12 ліпеня 1920 г., таму пытанне аб прыналежнасці Вільні і Гродна заставалася адкрытым. Раней Савет Лігі Нацый прапанаваў правесці на спрэчных землях плебісцыт пры зніжэнні колькасці войск Л. Жэлігоўскага, але Каўнас адмовіўся, прапаноўваючы ў студзені 1921 г. перанесці разгляд спрэчнага пытання на канферэнцыю ў Лондане. У лютым 1921 г. Г. В. Чычэрын пісаў, што часовая адмова Антанты прызнаць дэ-юрэ Літву ёсць спосаб прымусіць яе трымацца больш варожай лініі супраць Савецкай Расіі, таму Літве неабходна дыпламатычная дапамога з савецкага боку для падмацавання яе "спіннога хрыбта" [26, арк. 88, 89].

Польска-літоўскі канфлікт імкнуліся вырашыць структуры Антанты і Лігі Нацый. У 1921 г. пад эгідай Лігі Нацый і старшынством міністра замежных спраў Бельгіі П. Гіманса адбыліся перагаворы Польшчы і Літвы аб стварэнні "бікантанальнай" польска-літоўскай дзяржавы. Па меркаванні апошняга, штучна створаныя калідоры, якія існавалі паміж Расіяй і Польшчай, павінны быць ліквідаваны. У верасні Народны камісарыят замежных спраў (НКЗС) РСФСР указаў Літве, а затым і Польшчы: план Гіманса накіраваны на мінімізацыю незалежнасці Літвы, не ўзгоднены з Рыжскім дагаворам і садзейнічае жаданню Францыі "аб'яднаць усе акаляючыя заходнія межы савецкіх рэспублік дзяржавы" [27, с. 338–339, 521]. Урад Літвы хацеў прыняць план Гіманса, але ў снежні 1921 г. у сувязі з антыпольскімі настроямі ў грамадстве і арміі сейм гэты план адхіліў [28, арк. 9, 10]. У студзені 1922 г. адбыліся байкатаваныя літоўцамі, беларусамі, яўрэямі выбары ў Віленскі сейм: яго дэпутаты абвясцілі Віленшчыну "неад'емнай часткай Польшчы", падзякаваўшы Ю. Пілсудскаму за вызваленне ад "іншаземнага іга" [29, арк. 9–10]. Польскі сейм ратыфікаваў гэту пастанову. Вялікабрытанія і Францыя не лічылі, што парламенцкія выбары вырашылі віленскую праблему, але гатовы былі змяніць палітыку ў гэтым пытанні ў абмен на падтрымку Польшчай лініі Захаду на Генуэзскай канферэнцыі. Прадстаўнікі Літвы заяўлялі ў Генуі: літоўскія межы ўсталяваў дагавор з Савецкай Расіяй ад 12 ліпеня 1920 г., а паміж Польшчай і Літвой захоўваецца ваеннае становішча [30, арк. 6].

Супярэчнасці ва ўзаемаадносінах Польшчы і Літвы савецкае кіраўніцтва выкарыстоўвала ў сваіх інтарэсах. Г. В. Чычэрын у канцы 1920 – пачатку 1921 г. абяцаў літоўскаму ўраду дыпламатычную дапамогу РСФСР у вырашэнні віленскага пытання, патрабуючы ўзамен гарантыі ад Літвы, што кіраўнік урада БНР В. Ю. Ластоўскі, які знаходзіўся на яе тэрыторыі, адмовіцца ад падрыўной працы супраць Савецкай Беларусі. У дэпешы Г. В. Чычэрына паўнамоцнаму прадстаўніку НКЗС у Коўне А. Е. Аксельроду ўказвалася: "Мы выкажам згоду аб накіраванні Літве ноты па пытанні Вільны, калі будзе адначасова вырашана справа з Ластоўскім. Абавязацельствы Літвы распаўсюджваюцца і на Савецкую Беларусь" [31, арк. 12–15]. У выніку літоўскі бок перастаў падтрымліваць беларускіх нацыянальных дзеячаў і іх антыбальшавіцкую дзейнасць [32, арк. 10, 11, 13, 16]. Літоўскія ўлады, зацікаўленыя ў падтрымцы Савецкай Расіі ў спрэчках з Польшчай, не адразу, але ўсё ж такі прымусілі В. Ю. Ластоўскага падпісаць адпаведны дакумент, у якім старшыня Рады Народных Міністраў БНР прызнаў легітымнасць БССР. Літва таксама была не зацікаўлена ў страце саюзніка ў барацьбе з Польшчай. Таму вырашэнне справы зацягнулася са студзеня па люты 1921 г. Аднак адкрытае ўмяшанне ў віленскую праблему Лігі Нацый, адкрыццё польска-літоўскіх перагавораў у Бруселі з красавіка 1921 г., прыняцце рашэння Віленскім сеймам 20 лютага 1921 г. аб уключэнні тэрыторыі Сярэдняй Літвы ў склад Польшчы знізілі зацікаўленасць літоўскага боку ў беларускіх прадстаўніках.

Савецкае кіраўніцтва звяртала ўвагу і на праблему Мемельскай вобласці. У НКЗС РСФСР лічылі, што Польшча зацікаўлена ў валоданні Мемелем, але больш усяго яна праяўляе цікавасць для Літвы. Праблема цесна звязана з Вільняй і Віленскім краем, атрыманне толькі адной спрэчнай вобласці не вырашыць да канца літоўскія эканамічныя пытанні [28, арк. 29]. У выніку Канферэнцыя паслоў пакінула горад пад кантролем Лігі Нацый, а пытанне Віленшчыны – адкрытым,

хоць урад РСФСР у снежні 1922 г. звяртаў увагу Антанты на сваю зацікаўленасць у Мемеле, які складаў прыродны рынак для рускага збыту [33, с. 110–111].

Палітычныя і эканамічныя інтарэсы савецкіх рэспублік значна пагаршаў нявызначаны статус р. Нёман: яго аб'яўленне міжнароднай ракой ад г. Гродна да вусця дазваляла заходнім дзяржавам умешвацца ва ўнутраныя справы Літвы і звязаць Польшчу з Мемелем незалежна ад ажыццяўлення плана Гіманса. Невыпадкова Канферэнцыя паслоў абяцала прызнаць Літву дэ-юрэ пры ўмове яе згоды з інтэрнацыяналізацыяй Нёмана, але літоўскі ўрад выступіў супраць гэтай прапановы. У выніку пагоршыліся адносіны Літвы з дзяржавамі Антанты, якія пагадзіліся на далучэнне Віленшчыны да Польшчы дэ-факта, што зменшыла польскі ціск на Каўнас [34, арк. 23].

Савецкі ўрад быў супраць вырашэння пытання аб Нёмане без удзелу РСФСР і БССР. Вясной 1922 г. Я. Х. Даўцян, паўнамоцны прадстаўнік РСФСР у Літве, прасіў літоўскі ўрад дазволіць транзітны сплаў рускага лесу па Нёмане, але высветлілася, што рака закрыта і для польскага, і для савецкага транзіту, паколькі Літва знаходзіцца ў стане вайны з Польшчай. Паўнамоцнае прадстаўніцтва РСФСР указала, што гэтыя дзеянні супярэчаць дагавору 12 ліпеня 1920 г., усклаўшы на яе адказнасць за панесеныя страты [35, арк. 19, 36, 40–42].

У маі 1922 г. адбыліся перагаворы паміж міністрам прамысловасці і гандлю Польшчы Г. Тэненбаумам і саветнікам паўнамоцнага прадстаўніцтва РСФСР у Варшаве Л. Л. Абаленскім па эканамічных пытаннях, у тым ліку адносна паставак (сплаву) драўніны і прадуктаў яе перапрацоўкі з тэрыторыі БССР у Польшчу па р. Нёман. Аднак польскі ўрад выказаўся катэгарычна супраць арганізацыі паставак лесу "праз літоўскую мяжу, матывуючы гэта тым, што ў месцы пропуску ўсталявана нейтральная зона, не можа адбывацца якіх-небудзь перамяшчэнняў, адсутнічаюць добрасуседскія адносіны паміж Польшчай і Літвой па віне апошняй" [36, арк. 13]. Напружанасць савецка-польскіх адносін у адзначаны перыяд праяўлялася і пры вырашэнні праблемы заключэння гандлёвага дагавора і ўсталявання спрыяльных эканамічных адносін. Нават транзіт драўніны па польскай тэрыторыі суправаджаўся шматлікімі складанасцямі. Польскі бок за правоз лесу і лесаматэрыялаў ад савецка-польскай мяжы (раён Стаўбцоў) і да Граева чыгункай патрабаваў выплату кампенсацыі графу Ю. Чапскаму (1896–1993) за вырубку лесу на яго радавых землях у Мінскім і Ігуменскім паветах [36, арк. 97–101].

У справаздачы І. С. Грэйзбарда, упаўнаважанага РСФСР па сплаву пры праўленні Аб'яднання экспартнай лясной прамысловасці Заходняга раёна "Захадалесу", ад 17 мая 1922 г. паведамлялася аб затрымцы справы па сплаву драўніны па прычыне маруднасці ў атрыманні дазволу ад польскага ўрада. Нават планавалася, што драўніна прыбудзе чыгуначным транзітам да Стаўбцоў, а пасля па Нёмане будзе сплаўляцца да Гродна, потым на Граева (зноў чыгункай) або будзе абраны маршрут Стаўбцы – Ваўкавыск – Беласток – Граева – Мемель і Кёнігсберг чыгункай [36, арк. 20–20 адв.]. І. С. Грэйзбард сцвярджаў, што "сплаў, які адбываецца на вельмі значныя адлегласці, на тэрыторыі трох дзяржаў, з рознымі нестабільнымі эканамічнымі, прававымі і фінансавымі ўмовамі не можа адрозніваецца якімі-небудзь стабільнымі коштамі і дагаворамі" [36, арк. 46–47]. У шматлікай перапісцы паміж паўнамоцным прадстаўніцтвам РСФСР у Варшаве і НКЗС РСФСР Міністэрства замежных спраў (МЗС) Польшчы разглядаліся розныя шляхі дастаўкі беларускай драўніны. У выніку быў зменены канчатковы пункт дастаўкі з Мемеля на Данцыг. Транспарціроўка водным шляхам (па рэках) уступіла месца перамяшчэнню па чыгунцы.

30 чэрвеня 1922 г. Канферэнцыя паслоў краін Антанты прыняла рэзалюцыю па справе прызнання Літвы дэ-юрэ пры ўмове згоды з артыкуламі Версальскага трактата, якія датычыліся надання міжнароднага статусу для р. Нёман. У адказ літоўскі бок адмовіўся згадзіцца на прапанаваныя ўмовы. Галоўнымі прычынамі адмовы ўказваліся стан вайны паміж Польшчай і Літвой, невыкананне ўмоў Сувалкскага дагавора (лістапад 1920 г.) паміж бакамі, што рабіла свабодны транзіт на Нёмане небяспечнай справай. У сваю чаргу польскае кіраўніцтва ў інструкцыях да сваіх пасольстваў у Парыжы, Лондане, Рыме ад 8 верасня 1922 г. рэкамендавала ўсімі магчымымі сродкамі трансліраваць у прэсе і сярод афіцыйных прадстаўніцтваў краін Антанты сам факт недапушчальнасці літоўскіх паводзін, якія дыктуюць якія-небудзь умовы Канферэнцыі паслоў [37, s. 63]. Нягледзячы на дэмарш з боку Польшчы, 22 снежня 1922 г. Вялікабрытанія, Францыя, Італія і Японія прызналі Літву дэ-юрэ.

Пачатак палітычнага крызісу ў Цэнтральнай Еўропе быў абумоўлены абвастрэннем міжнароднага становішча ў сувязі з акупацыяй франка-бельгійскімі войскамі Рурскай вобласці ў студзені 1923 г. Частка польскіх палітыкаў і ваенных лічыла магчымым сумеснае франка-польскае выступленне супраць Германіі, а Польшча тым часам, выкарыстоўваючы напружаную сітуацыю ў рэгіёне, дабілася ад Антанты 15 сакавіка прызнання свайго суверэнітэту над Усходняй Галіцыяй. Пасля гэтага польскі бок актывізаваўся супраць Германіі. У сакавіку 1923 г. кіраўнік польскага Генштаба генерал С. Галлер заклікаў распаўсюдзіць польскі ўплыў у Літве, баючыся, што руска-нямецкі ўплыў у Літве і Латвіі стане настолькі моцным, што яны страцяць незалежнасць, а таксама ўсходні калідор і Вільню [38, с. 31–33, 42–44]. Савецкае кіраўніцтва ўважліва сачыла за падрыхтоўкай Польшчы да магчымых акцый супраць Германіі. Сур'ёзна ўспрымаліся польскія планы ў адносінах Данцыга: яго стратэгічнае значэнне для Расіі прадэманстравала польска-савецкая вайна 1919–1921 гг., калі праз порт "вольнага горада" Антанта імкнулася забяспечваць Польшчу ўсім неабходным для вядзення ваенных дзеянняў. Тым часам польскія кіруючыя колы павялічвалі палітычны ціск на Данцыг: у красавіку прэм'ер-міністр У. Сікорскі і прэзідэнт С. Вайцэхоўскі ажыццявілі дэманстратыўныя паездкі ў Памор'е (Данцыгскі калідор).

У канцы мая да ўлады ў Польшчы прыйшла прафранцузская правацэнтрысцкая групоўка, якая сфарміравала кааліцыйны ўрад "Хьена" – "Пяст" на чале з В. Вітасам. Новыя ўлады актывізавалі палітыку супраць Германіі, Літвы і Данцыга, маючы надзеі на падтрымку Францыяй сваіх ваенных акцый. На ваенную акупацыю Данцыга Польшча не рашылася: яе эканоміка і фінансы знаходзіліся ў стане глыбокага крызісу, у краіне адбываліся рэвалюцыйныя выступленні рабочых, абвастралася нацыянальнае пытанне ва ўсходніх ваяводствах. Пагоршылася міжнароднае становішча Польшчы – палітыка Францыі ў Руры прывяла да расколу Антанты, змяніўшы суадносіны сіл у Еўропе на карысць Антанты, саперніцы анексіяніcцкіх польскіх планаў у рэгіёне.

У кастрычніку 1923 г. Палітбюро ЦК РКП(б) накіравала ў Коўна, Рыгу і Варшаву В. Л. Копа з мэтай абследавання "даверанаых яму паўнамоцных прадстаўніцваў" [39, арк. 163]. Асабліва важна было даведацца пра пазіцыю польскага ўрада, які лічыў, што паводзіны Савецкай Расіі адлюстроўваюць "канспіратыўную яе падрыхтоўку да ўзброенага ўмяшання на карысць германскай рэвалюцыі" [40, арк. 13]. Акрамя перагавораў з кіраўніцтвам польскага МЗС, член калегіі НКЗС шукаў магчымасць пропуску частак Чырвонай Арміі ў Германію праз Польшчу, абяцаючы апошняй "свабоду дзеянняў" ва Усходняй Прусіі. Аднак паколькі змяншалася вастрыня палітычнага крызісу ў Веймарскай рэспубліцы, гатоўнасць савецкага кіраўніцтва дапамагаць плануемай германскай рэвалюцыі шляхам уступак Польшчы за кошт Германіі знікала.

Акупацыя Францыяй Рура стварыла прэцэдэнт, які быў выкарыстаны Літвой для вырашэння праблемы Мемельскай вобласці, якую ў студзені 1923 г. занялі атрады літоўскіх "паўстанцаў". 28 лютага Г. В. Чычэрын у лісце да літоўскага пасла Ю. К. Балтрушайціса ўказваў, што для Германіі больш спрыяльна ўключэнне Мемеля ў склад Літвы, чым Польшчы. У сваю чаргу літоўскі пасол прасіў савецкага народнага камісара пасадзейнічаць паляпшэнню адносін паміж Літвой і Германіяй.

У лютым Канферэнцыя паслоў перадала суверэнітэт над Мемелем Літве, пачаліся перагаворы аб выкарыстанні порта іншымі краінамі. Прэм'ер-міністр Францыі Р. Пуанкарэ лічыў рашэнне Мемельскага пытання больш важным, чым Рурскага, паколькі ў магчымы польска-літоўскі канфлікт мог умяшацца СССР. Для савецкага ўрада галоўным у той час з'яўляўся ўлік яго інтарэсаў пры вырашэнні пытання аб Мемелі і суднаходстве па Нёмане [33, с. 205–206]. Цікавасць СССР да Мемеля ўзрасла пасля падпісання 1 чэрвеня германа-літоўскага гандлёвага дагавора, які прадугледжваў свабодны транзіт у трэцюю краіну.

За Мемель Польшча чакала больш значнай кампенсацыі, чым магчымае прадастаўленне ёй ільгот у порце. Яшчэ ў 1922 г. яна патрабавала замены на тэрыторыі Віленшчыны нейтральных палос на часовай дэмаркацыйнай лініі. Савет Лігі Нацый падзяліў 3 лютага 1923 г. буферную вобласць паміж Літвой і Польшчай. У размове Г. В. Чычэрына і Ю. К. Балтрушайціса 28 лютага 1923 г. літоўскі прадстаўнік указваў, што Польшча атрымоўвае чыгунку Вільна–Гродна, якая праходзіць па нейтральнай паласе. 1 сакавіка народны камісар замежных спраў заявіў польскаму

паверанаму ў Маскве, што ад захопу чыгункі можа скласціся ўяўленне аб стварэнні стратэгічных камунікацыйных ліній на выпадак наступлення на СССР [41, арк. 7].

У лютым – пачатку красавіка 1923 г. адбыўся абмен нотамі паміж СССР і Польшчай. У выніку МЗС Польшчы канстатавала, што атрыманне польскім бокам чыгуначнай лініі Варшава–Вільна ўпэўнівае польскі ўрад у тым, што пагроза ваенных канфліктаў на ўсходзе Еўропы канчаткова ліквідавана, а гэта адпавядае пажаданням СНК. 10 сакавіка Савет Міністраў Польшчы даў указанне міністру замежных спраў дабівацца ад Антанты згоды на канчатковае далучэнне да Польшчы Віленскага краю [38, с. 221–222]. 15 сакавіка Канферэнцыя паслоў пастанавіла пакласці ў аснову польска-літоўскай мяжы прызначаную Лігай Нацый дэмаркацыйную лінію. Нягледзячы на пратэсты Літвы, Савет Лігі Нацый пацвердзіў гэта рашэннне, якое СССР не прызнаў. Пасля вырашэння пытання аб Мемелі на карысць Літвы савецкі бок больш настойліва патрабаваў урэгуляваць транзіт па р. Нёман. Спачатку сплаву беларускага лесу супрацiўляліся літоўскія лесапрамыслоўцы, якія баяліся канкурэнцыі. Але затым, па меркаванні В. Л. Копа, супраць транзіту магла выступіць Польшча, каб шантажыраваць Літву. Савецкі паўнамоцны прадстаўнік у Літве І. Л. Лорэнц пісаў В. Л. Копу: “У выпадку адкрыцця Нёмана для нас ён будзе адкрыты і для Польшчы, перагаворамі з Літвой аб сплаве па Нёмане становіцца пасрэднікам у гэтым пытанні паміж Літвой і Польшчай, што дазваляе выкарыстоўваць Літву супраць Польшчы” [41, арк. 115–116, 272].

13 ліпеня 1923 г. міністр замежных спраў Польшчы ў новай дырэктыве для паслоў у Францыі і Вялікабрытаніі адзначаў, што справу адкрыцця транзіту праз Літву і зняцце блакады на Нёмане неабходна прызнаць важнай і першачарговай. Неабходна патрабаваць ад Канферэнцыі паслоў, каб яна ўнесла ў канвенцыю па прызнанні Мемеля за літоўскім бокам патрабаванне аб зняцці блакады р. Нёман [42, s. 83–85].

На працягу ўсяго 1923 г. адносіны СССР і Літвы зведалі сур’ёзныя змены. Абвастрэнне міжнароднага становішча ў Еўропе і барацьба за ўладу ў польскіх кіруючых колах садзейнічалі, па меркаванні літоўскага боку, ажыццяўленню плана адрыву ад Польшчы ўсходніх крэсаў. У сакавіку 1923 г. у Берліне адбылася сустрэча літоўскага міністра замежных спраў Ю. Пурыцкіса з прадстаўнікамі нямецкіх і ўкраінскіх нацыяналістаў. Галоўнай тэмай стаў праект стварэння на тэрыторыі Літвы, Германіі, Чэхаславакіі, СССР партызанскіх баз, засноўваючыся на якіх, у Польшчы можна было б узняць паўстанне нацыянальных меншасцей. У выпадку поспеху Літоўская рэспубліка атрымоўвала Віленскі край, ствараліся Заходнеўкраінская і Заходнебеларуская дзяржавы. Зразумела, што сама ідэя была настолькі ўтапічная, што верагоднасць яе рэалізацыі на практыцы набліжалася да нуля. Пасля актывізацыі савецкіх намераў па дэстабілізацыі ўнутрыпалітычнай сітуацыі Германіі літоўскі бок пачаў схіляцца на карысць Польшчы. 25 мая Н. Плічэ паведаміў Я. С. Ганецкаму аб размове з кіраўнікамі “беларускіх партызан”, якія змагаліся пад кіраўніцтвам літоўскага камандавання з Польшчай. Літоўскі бок прыняў рашэнне аб раззбраенні гэтых сіл па абвінавачванні ў бальшавізме [41, арк. 421–422]. І. Л. Лорэнц заўважаў, што частка беларускіх нацыяналістаў збіраецца пераязджаць з Коўна ў Прагу, а гэта адарве іх ад антыпольскай працы [41, арк. 389].

6 лістапада 1923 г. польскі пасол у Лондане К. Скірмунт сустрэўся з намеснікам сакратара Форын Офіс Р. Лінсэем. Галоўная тэма сустрэчы – наладжванне спрыяльных польска-літоўскіх адносін. Польскі прадстаўнік адзначаў, што літоўскае кіраўніцтва ў справе вырашэння спрэчных пытанняў з Польшчай у першую чаргу разлічвае на дапамогу з боку СССР, “нават гатова ўвайсці ў склад Савецкай дзяржавы за яе згоду перадаць Віленшчыну Літве” [43, s. 148–149]. Падчас сустрэчы К. Скірмунта з лордам Р. Сэсілем англійскі бок рэкамендаваў Польшчы ў выпадку немагчымасці дасягнуць палітычнага кампрамісу спыніцца на пытаннях нармалізацыі эканамічных зносін. Тыя ж самыя парады атрымаў польскі пасол у Вялікабрытаніі і ад міністра замежных спраў лорда Д. Керзана. У канцы 1923 г. Вялікабрытанія прызнала часовае закрыццё польска-літоўскай мяжы, паколькі “ў яе ёсць больш значныя інтарэсы ў Польшчы, чым адкрыццё руху лесу на Нёмане” [41, арк. 342–343].

4 снежня 1923 г. В. Л. Коп паведамляў у Палітбюро ЦК РКП (б) аб магчымасці падпісання паміж СССР і Літвой двух дагавораў: аб транзіце і паміж генеральнымі штабамі, а таксама палітычнага

дагавора. Апошні прадугледжваў у выпадку польска-савецкай вайны сумесныя дзеянні ўзброеных сіл СССР і Літвы супраць Польшчы па ўзгодненаму генштабамі абедзвюх краін плану, а таксама перадачу вызваленай Віленшчыны Літве. У праекце пратакола да дагавора ўказвалася на неўмяшанне бакоў ва ўнутраныя справы Германіі, свабоду эканамічных зносін незалежна ад магчымых перамен у яе ўнутраным ладзе. Літва абяцала не парушаць тэрытарыяльнай цэласнасці Германіі і забяспечыць свабодны савецка-германскі транзіт пры любых палітычных умовах.

СССР узняў рад пытанняў, у прыватнасці, па аднаўленні перагавораў аб транзіце па Нёмане. Паколькі рака працякала па тэрыторыі акупіраванага Польшчай Віленскага краю, Літва забараніла транзіт па сваёй частцы Нёмана, што наносіла ўрон інтарэсам СССР. Пасля транзіт па Нёмане забараніла і Польшча. У лютым 1924 г. трэст "Захадалес" праз паўнамоцнае прадстаўніцтва ў Польшчы імкнуўся атрымаць дазвол на пропуск лесу праз польска-літоўскую мяжу. У выніку перапіскі знешнепалітычных ведамстваў стала зразумелым, што літоўскі бок дазваляе свабодны транзіт з СССР у Мемель, але Варшава абумоўлівае сплаў па Нёмане ўрэгуляваннем адносін з Літвой. НКЗС у сваім звароце да МЗС Польшчы пісаў, што прапанова польскага боку аб пропуску лесу ў напрамку Данцыга і Кёнігсберга, абыходзячы літоўскую тэрыторыю ў сувязі з занядбанасцю Аўгустоўскага канала і дарагоўлей фрахтаў, была непрымальная [44, арк. 125]. Упаўнаважаны па сплаву лесу пры УСНГ РСФСР І. С. Грэйзбард у верасні 1922 г. зазначаў, што амаль поўнае спыненне руху лесаматэрыялаў з дапамогай сплаву і выкарыстанне чыгуначнага транспарту абумоўлены тым, што водны шлях вельмі працяглы, умовы сплаву нявызначаныя ў сувязі з амаль поўным спыненнем сплаву за гады вайны і станам Аўгустоўскага канала, з-за чаго амаль прыпыніўся сплаў з багатага лесам басейна Нёмана [45, арк. 171–173].

Спрэчныя пытанні адносна статусу р. Нёман і Мемельскага порта стваралі складанасці ў арганізацыі савецкага транзіту. Вялікабрытанія і Францыя настойвалі на наданні міжнароднага характару Нёману і выказваліся супраць удзелу СССР у перагаворах аб лёсе Мемеля. Польшча, якая аб'явіла аб блакадзе Нёмана, тым самым пагоршыла эканамічны стан рэгіёна. Зацверджаны Саветам паслоў 13 сакавіка 1924 г. Мемельскі статус не задавольваў савецкі бок, але спробы адстаяць свае інтарэсы, а таксама суверэнныя правы Літвы былі безвыніковымі. Новыя патрабаванні СССР польскаму кіраўніцтву аб пропуску драўніны па р. Нёман не прывялі да жаданых вынікаў. Пытанне сплаву лесу па Нёману не вырашылі ні польска-літоўскія перагаворы ў верасні-кастрычніку 1925 г., ні савецка-літоўскія сустрэчы ў лістападзе-снежні 1925 г. Нават у лютым 1931 г. міністр замежных спраў Літвы Д. Зауніс указваў сакратару паўнамоцнага прадстаўніцтва ў Коўне М. А. Карскаму, што Нёман паміж Гродна і Друскенікамі ўяўляе сабой участак дэмаркацыйнай лініі, на адным баку знаходзяцца літоўцы, на другім – палякі [46, арк. 42]. У выніку пастаўкі савецкіх тавараў у Мемель ажыццяўляліся і ў 1930-я гг., згодна з Кёнігсбергскай чыгуначнай канвенцыяй 1925 г. праз Латвію.

**Высновы.** Такім чынам, савецкае кіраўніцтва па магчымасці выкарыстоўвала геапалітычнае становішча, якое складвалася на захадзе РСФСР (СССР), для ўмацавання сваіх пазіцый унутры краіны і на міжнароднай арэне. Разам з тым наяўнасць у складзе Польшчы нацыянальных меншасцей, этнічна і культурна блізкіх насельніцтву Савецкай Украіны і Савецкай Беларусі, антыпольскія рэвізіяніцкія памкненні Германіі і Літвы абумовілі магчымасць уцягвання Савецкай дзяржавы ў спрэчкі гэтых краін па тэрытарыяльных праблемах. Гэтымі абставінамі і спробамі Захаду стварыць антысавецкі санітарны кардон тлумачылася ўвага савецкага кіраўніцтва да рэгіёна. Падпісанне Рыжскага мірнага дагавора і пачатак новай эканамічнай палітыкі з'явіліся адпраўной кропкай у паступовым працэсе пераходу да рэальнай ацэнкі міжнароднага становішча, але знешнепалітычныя дзеянні Савецкай дзяржавы мелі, як і раней, супярэчлівы характар. Да таго ж існавала нявырашанасць статусу спрэчных тэрыторый, што павышала ўзровень канфліктнасці ў рэгіёне.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Мархлевский, Ю. Война и мир между буржуазной Польшей и пролетарской Россией : пер. с пол. / Ю. Мархлевский. – М. : Гос. изд-во, 1921. – 42 с.
2. Иоффе, А. Мирное наступление / А. Иоффе. – Петербург : Гос. изд-во, 1921. – 39 с.

3. Радек, К. Третий год борьбы Советской республики против мирового капитала / К. Радек. – М. : Госполитиздат, 1921. – 26 с.

4. История Польши : в 3 т. / под ред. Ф. Г. Зуева [и др.]. – М., 1958. – Т. 3. – 667 с.

5. Зуев, Ф. Г. Международный империализм – организатор нападения панской Польши на Советскую Россию (1919–1920 гг.) / Ф. Г. Зуев. – М. : Госполитиздат, 1954. – 232 с.

6. Ольшанский, П. Н. Рижский мир: из истории борьбы Советского правительства за установление мирных отношений с Польшей (конец 1918 – март 1921 г.) / П. Н. Ольшанский. – М. : Наука, 1969. – 260 с.

7. Dmowski, R. Polityka polska i odbudowanie państwa / R. Dmowski. – Wyd. 2. – Warszawa : Księg. Perzyński, Niklewicz i Ska, 1926. – 496 s.

8. Bobrzyński, M. Wskrzeszenie państwa polskiego : szkic historyczny / M. Bobrzyński. – Kraków : Krakowska Spółka Wydawnicz, 1925. – T. 2 : 1918–1923. – 300 s.

9. Gostyńska, W. Stosunki polsko-radzieckie, 1918–1919 / W. Gostyńska. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1972. – 397 s.

10. Deruga, A. Polityka wschodnia Polskiwobeczziem Litwy, Białorusii, Ukrainy (1918–1919) / A. Deruga. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1969. – 330 s.

11. Kumaniecki, J. Po traktacie ryskim: stosunki polsko-radzieckie, 1921–1923 / J. Kumaniecki. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1971. – 282 s.

12. Łossowski, P. Stosunki polsko-litewskie, 1921–1939 / P. Łossowski. – Warszawa : Inst. Historii PAN, 1997. – 388 s.

13. Materski, W. Polska a ZSSR, 1923–1924 / W. Materski. – Wrocław : Ossolineum, 1981. – 380 s.

14. Михутина, И. В. Польско-советская война 1919–1920 гг. / И. В. Михутина ; отв. ред. Ю. С. Новопашин. − М. : ИСБ РАН, 1994. – 323 с.

15. Советская внешняя политика в ретроспективе, 1917–1991 : [сб. ст.] / Ин-т всеобщ. истории РАН [и др.] ; [редкол.: А. О. Чубарьян (отв. ред.) и др.]. – М. : Наука, 1993. – 206 с.

16. Шишкин, В. А. Становление внешней политики послереволюционной России (1917–1930 годы) и капиталистический мир: от революционного «западничества» к «национал-большевизму» / В. А. Шишкин. – СПб. : Д. Буланин, 2002. – 360 с.

17. Зубачевский, В. А. Политика России в Центрально-Восточной Европе (первая треть XX века): геополитический аспект / В. А. Зубачеcкий. – М. : РОССПЭН, 2019. – 278 с.

18. Зубачевский, В. А. Советская политика на востоке Центральной Европы (1924–1925 гг.) / В. А. Зубачевский // Вопр. истории. – 2008. – № 6. – С. 94–108.

19. Бабенко, О. В. Польско-советские отношения в 1924–1928 гг. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.03 / О. В. Бабенко. – М., 2006. – 283 л.

20. Борисёнок, Ю. А. На крутых поворотах белорусской истории: общество и государство между Польшей и Россией в первой половине XX в. / Ю. А. Борисёнок. – М. : Родина МЕДИА, 2013. – 351 с.

21. Мезга, Н. Н. Западная Беларусь в советско-польских отношениях: от Рижского договора до воссоединения с БССР / Н. Н. Мезга // Журн. Белорус. гос. ун-та. История. – 2019. – № 4. – С. 17–26. https://doi.org/10.33581/2520-6338-2019-4-17-26

22. Мезга, Н. Н. Советско-польские отношения 1921–1926 годов: новый этап противостояния / Н. Н. Мезга. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2019. – 229 с.

23. Лазько, Р. Р. Перад патопам: еўрапейская палітыка Польшчы (1932–1939) / Р. Р. Лазько. – Мінск : БДУ, 2000. – 354 с.

24. Цынкевіч, В. Праблема рэпатрыяцыі бежанцаў і адкрыццё польскага консульства ў Мінску (1921–1924 гг.) / В. Цынкевіч // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. – 2001. – № 3. – С. 76–83.

25. Wojna polsko-sowiecka 1920 roku: przebieg walk i tło międzynarodowe : materiały ses. nauk. w Inst. Historii PAN, 1–2 paźdz. 1990 / Pol. Akad. Nauk, Inst. Historii ; ed. A. Koryn. – Warszawa : Wydawn. Inst. Historii PAN, 1991. – 235 s.

26. Архіў знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (АЗП РФ). – Ф. 04. Воп. 32. Д. 205. Спр. 52437.

27. Документы внешней политики СССР : в 24 т. / М-во иностр. дел СССР. – М. : Госполитиздат, 1960. – Т. 4 : 19 марта 1921 г. – 31 декабря 1921 г. – 812 с.

28. АЗП РФ. – Ф. 151. Воп. 4. Д. 6. Спр. 14.

29. АЗП РФ. – Ф. 151. Воп. 5. Д. 9. Спр. 17.

30. АЗП РФ. – Ф. 151. Воп. 5. Д. 9. Спр. 20.

31. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ). – Ф. 5. Воп. 2. Спр. 2000.

32. РДАСПГ. – Ф. 5. Воп. 1. Спр. 2111.

33. Документы внешней политики СССР : в 24 т. / М-во иностр. дел СССР. – М., 1962. – Т. 6 : 20 ноября 1922 г. – 31 декабря 1924 г. – 646 с.

34. РДАСПГ. – Ф. 504. Воп. 1. Спр. 270.

35. АЗП РФ. – Ф. 151. Воп. 5. Д. 8. Спр. 5.

36. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 72. Воп. 1. Спр. 19.

37. Archiwum aktów nowych (AAN). – Zespół. Ambasada Paryz. Sygn. 122.

38. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 11 т. / АН СССР, Ин-т славяноведения, Сектор истории пол.-совет. отношений ; под ред. И. А. Хренова. – М., 1966. – Т. 4 : апрель 1921 г. – май 1926 г. – 560 с.

39. РДАСПГ. – Ф. 359. Воп. 1. Спр. 4.

40. АЗП РФ. – Ф. 165б. Воп. 2. Д. 5. Спр. 27.

41. АЗП РФ. – Ф. 151. Воп. 9. Д. 10. Спр. 19.

42. AAN. – Zespół. Ambasada Paryz. Sygn 217.
43. AAN. – Zespół. Ambasada Paryz. Sygn. 64.
44. АЗП РФ. – Ф. 122. Воп. 7. Д. 31. Спр. 2.
45. НАРБ. – Ф. 72. Воп. 1. Спр. 102.
46. АЗП РФ. – Ф. 010. Воп. 2. Д. 13. Спр. 202.

## References

1. Marchlewski J. *War and peace between bourgeois Poland and proletarian Russia*. Moscow, State Publishing, 1921. 42 p. (in Russian).

2. Ioffe A. *Peace offensive*. Petersburg, State Publishing, 1921. 39 p. (in Russian).

3. Radek K. *The third year of the struggle of the Soviet Republic against world capital*. Moscow, Gospolitizdat Publ., 1921. 26 p. (in Russian).

4. Zuev F. G. (ed.). *History of the Poland. Vol. 3*. Moscow, 1958. 667 p. (in Russian).

5. Zuev F. G. *International imperalism is the organiser of the attack of pan Poland on Soviet Russia 1919–1920*. Moscow, Gospolitizdat Publ., 1954. 232 p. (in Russian).

6. Ol'shanskii P. N. *Riga world: from the history of the struggle of the Soviet government for the establishment of peaceful relations with Poland (late 1918 – March 1921)*. Moscow, Nauka Publ., 1969. 260 p. (in Russian).

7. Dmowski R. *Polityka polska i odbudowanie państwa* [Polish policy and the rebuilding of the state]. 2nd ed. Warszawa, Księgarnia Perzyński, Niklewicz i Ska, 1926. 496 p. (in Polish).

8. Bobrzyński M. *Wskrzeszenie państwa polskiego: szkic historyczny. T. 2* [The Resurrection of the Polish State: a historical sketch. Vol. 2]. Kraków, Krakowska Spółka Wydawnicz, 1926. 300 p. (in Polish).

9. Gostyńska, W. *Stosunki polsko-radzieckie, 1918–1919* [Polish-Soviet relations, 1918–1919]. Warszawa, Książka i Wiedza, 1972. 397 p. (in Polish).

10. Deruga A. *Polityka wschodnia Polskiwobecziem Litwy, Białorusii, Ukrainy (1918–1919)* [Eastern policy of Poland towards the lands of Lithuania, Belarus and Ukraine (1918–1919)]. Warszawa, Książka i Wiedza, 1969. 330 p. (in Polish).

11. Kumaniecki J. *Po traktacie ryskim: stosunki polsko-radzieckie, 1921–1923* [After the treaty of Riga: Polish-Soviet relations, 1921–1923]. Warszawa, Książka i Wiedza, 1971. 282 p. (in Polish).

12. Łossowski, P. *Stosunki polsko-litewskie, 1921–1939* [Polish-Lithuanian relations, 1921–1939]. Warszawa, Instytut Historii PAN, 1997. 388 p. (in Polish).

13. Materski W. *Polska a ZSSR, 1923–1924* [Poland and USSR, 1923–1924]. Wrocław, Ossolineum, 1981. 380 p. (in Polish).

14. Mikhutina I. V. *Polish-Soviet war 1919–1920*. Moscow, Institute of Slavic and Balkan Studies RAS, 1994. 323 p. (in Russian).

15. Chubar'yan A. O. (ed.). *Soviet foreign policy in retrospect, 1917–1991: collection of articles*. Moscow, Nauka Publ., 1993. 206 p. (in Russian).

16. Shishkin V. A. *The Formation other foreign policy of post-revolutionary Russia (1917–1930) and the capitalist world: from revolutionary "Westernism" to "National-Bolshevism"*. St. Petersburg, D. Bulanin Publ., 2002. 360 p. (in Russian).

17. Zubachevskii V. A. *Russian policy Cenrtal and Eastern Europe (first third of the 20th century): geopolitical aspect*. Moscow, ROSSPEN Publ., 2019. 278 p. (in Russian).

18. Zubachevskii V. A. Soviet policy in the east of Central Europe (1924–1925). *Voprosy istorii* [Questions of History], 2008, no. 6, pp. 94–108 (in Russian).

19. Babenko O. V. *Polish-Soviet relations in 1924–1928*. Ph. D. Thesis. Moscow, 2006. 283 p. (in Russian).

20. Borisenok Yu. A. *On the sharp turns of Belarusian history: society and the state between Poland and Russia in the first half of the 20th century*. Moscow, Rodina MEDIA Publ., 2013. 351 p. (in Russian).

21. Miazga M. M. Western Belarus in soviet-polish relations: from the treaty of Riga to reunification with the BSSR. *Zhurnal Belorusskogo gosudarstvennogo univesiteta. Istoriya = Journal of the Belarusian State University. History*, 2019, no. 4, pp. 17–26 (in Russian). https://doi.org/10.33581/2520-6338-2019-4-17-26

22. Mezga N. N. *Soviet-Polish relations in 1921–1926: a new stage of confrontation*. Gomel, Francisk Skorina Gomel State University, 2019. 229 p. (in Russian).

23. Laz'ko R. R. *Before the flood (European Policy of Poland 1932–1939)*. Minsk, Belarusian State Universirty, 2000. 354 p. (in Belarusian).

24. Tsynkevich V. The problem of the refugee repatriation and opening of the Polish consulate in Minsk (1921–1924). *Belorusskii zhurnal mezhdunarodnogo prava i mezhdunarodnykh otnoshenii* [Belarusian Journal of International Law and International Relations], 2001, no. 3, pp. 76–83 (in Belarusian).

25. *Wojna polsko-sowiecka 1920 roku: przebieg walk i tło międzynarodowe: materiały sesji naukowej w Instytucie Historii PAN, 1–2 października 1990* [The Polish-Soviet war of 1920: the run of the walk and the international background: materials of the scientific session at the Institute of History of the Polish Academy of Sciences, October 1–2, 1990]. Warszawa, Wydawnitstwo Instytutu Historii PAN, 1991. 235 p. (in Polish).

26. *Foreign Policy Archive of the Russian Federation*. F. 04. Op. 32. D. 205. S. 52437.

27. USSR Ministry of Foreign Affairs. *Documents of foreign policy of the USSR. Vol. 4*. Moscow, Gospolitizdat Publ., 1960. 812 p. (in Russian).

28. *Foreign Policy Archive of the Russian Federation*. F. 151. Op. 4. D. 6. S. 14.

29. *Foreign Policy Archive of the Russian Federation*. F. 151. Op. 5. D. 9. S. 17.

30. *Foreign Policy Archive of the Russian Federation*. F. 151. Op. 5. D. 9. S. 20.
31. *Russian State Archive of Socio-Political History*. F. 5. Op. 2. D. 2000.
32. *Russian State Archive of Socio-Political History*. F. 5. Op. 1. D. 2111.
33. USSR Ministry of Foreign Affairs. *Documents of foreign policy of the USSR. Vol. 6*. Moscow, Gospolitizdat Publ., 1962. 646 p. (in Russian).
34. *Russian State Archive of Socio-Political History*. F. 504. Op. 1. D. 270.
35. *Foreign policy archive of the Russian Federation*. F. 151. Op. 5. D. 8. S. 5.
36. *National Archives of the Republic of Belarus*. F. 72. Op. 1. D. 19. (in Belarusian).
37. *Archiwum aktów nowych (AAN)*. Zespół. Ambasada Paryz. Sygn. 122. (in Polish).
38. Khrenov I. A. (ed.). *Documents and materials on the history of Soviet-Polish relations. Vol. 4*. Moscow, 1966. 560 p. (in Russian).
39. *Russian State Archive of Socio-Political History*. F. 359. Op. 1. D. 4.
40. *Foreign Policy Archive of the Russian Federation*. F. 165b. Op. 2. D. 5. S. 27.
41. *Foreign Policy Archive of the Russian Federation*. F. 151. Op. 9. D. 10. S. 19.
42. *Archiwum aktów nowych*. Zespół. Ambasada Paryz. Sygn. 217. (in Polish).
43. *Archiwum aktów nowych*. Zespół. Ambasada Paryz. Sygn. 64. (in Polish).
44. *Foreign Policy Archive of the Russian Federation*. F. 122. Op. 7. D. 31. S. 2.
45. *National Archives of the Republic of Belarus*. F. 72. Op. 1. D. 102. (in Belarusian).
46. *Foreign Policy Archive of the Russian Federation*. F. 010. Op. 2. D. 13. S. 202.

## Информация об авторе

**Боровская Ольга Николаевна** – кандидат исторических наук, старший научный сотрудник. Институт истории, Национальная академия наук Беларуси (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: borovskaya-olga@mail.ru. https://orcid.org/0000-0001-7164-7432

## Information about the author

**Volha N. Borovskaya** – Ph. D. (Hist.), Senior Scientific Researcher. Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Academicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: borovskaya-olga@mail.ru. https://orcid.org/0000-0001-7164-7432